**Алена Беразоўская**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# ПІСЬМЕННІК – ГЕРОЙ РАДЫЁПРАГРАМЫ: АСАБЛІВАСЦІ ЖАНРАВАГА ЎВАСАБЛЕННЯ

Прысутнасць пісьменніка на радыё мае сваю гісторыю і характарызуецца некалькімі жанравымі арыенцірамі. З аднаго боку, пісьменнік можа выступаць як актыўны суб’ект радыёэфіру, прапануючы аўдыторыі свае прамовы, развагі, каментарыі непасрэдна ля мікрафона. З другога боку, прысутнасць самога аўтара ля мікрафона для наладжвання дыялогу з аўдыторыяй радыё – неабавязковая ўмова, таму што можа быць скарыстана і адаптавана да эфіру яго мастацкая спадчына: так, аповесць пры дапамозе рэжысёраў можа ператварыцца ў новы твор мастацтва – радыёспектакль; вершы, ужытыя ў пэўнай паслядоўнасці і аздобленыя прыдатнай музыкай, утвараюць тэматычную радыёкампазіцыю; нарыс, агучаны прафесійнымі акцёрамі і дапоўнены спецыфічнымі выяўленчымі сродкамі радыё, набывае новыя рысы, неўласцівыя твору ў друкаваным выглядзе.

Ёсць яшчэ адна форма супрацоўніцтва паміж пісьменнікам і радыё, калі ў цэнтры ўвагі – сам пісьменнік як асоба, яго творчы і літаратурны шлях. Для такой формы супрацоўніцтва характэрна некалькі тыповых схем: «журналіст – пісьменнік» (дыялагічныя праграмы, выкананыя, як правіла, у жанры радыёінтэрв’ю, радыёгутаркі), «журналіст – эксперт» (у якасці эксперта можа выступаць знаўца творчасці пісьменніка, грамадскі дзеяч і інш.), «журналіст пра пісьменніка» (маналагічныя праграмы, у якіх журналіст расказвае аб творчасці таго ці іншага аўтара, у журналісцкай практыцы сустракалася пад назвай «гутарка»).

Вядома, самай папулярнай і натуральнай «схемай» з’яўляецца першая, калі наладжваецца адкрыты дыялог з пісьменнікам, больш за тое, гэта практычна адзіная форма, якая і сёння не страціла сваёй актуальнасці і папулярнасці. У гісторыі Беларускага радыё, вядома, было шмат праектаў, пабудаваных па такой схеме, адзін з самых вядомых – аўтарская пра-

грама журналіста і пісьменніка Уладзіміра Мехава «Сустрэчы ў радыёстудыі», якая выходзіла ў 70–80-я гады мінулага стагоддзя і мела вялікую колькасць прыхільнікаў. Нездарма ў 1985 годзе на хвалі папулярнасці ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла аднайменная кніга У. Мехава «Сустрэчы ў радыёстудыі: дыялогі». Уладзімір Мехаў сустракаўся ў студыі не толькі з пісьменнікамі, а і з мастакамі, архітэктарамі, акцёрамі, рэжысёрамі, спевакі, а часам і з палітыкамі.

Для сучаснага радыё маналагічныя формы журналісцкіх твораў нехарактэрныя, а, тым не менш, у гісторыі Беларускага радыё яны знаходзілі свайго слухача. Так, можна ўзгадаць гутаркі аб творчасці, якія хутчэй нагадвалі радыёлекторый. Гутаркі, як і іншыя матэрыялы, уключаліся ў тэматычныя планы рэдакцыі і выходзілі рэгулярна. Выбар персоны для гутаркі часцей за ўсё быў абумоўлены юбілеямі, гадавінамі і іншымі каляндарнымі падставамі.

Сёння, на жаль, пісьменнік усё радзей становіцца героем радыёпраграмы. Новыя задачы вяшчання пасля 1990-х гадоў і новыя ўмовы, у якіх яно стала працаваць, прывялі да адмаўлення ад многіх ранейшых форм зносін з аўдыторыяй, у эфіры запатрабаваным стала жывое непадрыхтаванае маўленне. Адна з асноўных тэндэнцый сучаснага вяшчання – адмаўленне ў значнай ступені ад пісьмовых тэкстаў.

Тым не менш нельга катэгарычна сказаць, што сёння ўвогуле няма пісьменніцкага слова на радыё. Так, напрыклад, на радыёканале «Культура» ў праграме «Літаратурная анталогія» чытаюцца творы маладых аўтараў, аўтарытэтных класікаў у выкананні акцёраў. Але гэта ўскосны ўдзел пісьменніка.

Чаму ж некалькі дзесяцігоддзяў таму пісьменніцкае слова было такім запатрабаваным на радыё, пісьменнікі не толькі прыносілі ў рэдакцыю свае новыя творы, але і выказвалі свае меркаванні па той ці іншай грамадскай праблеме? На думку вядомага беларускага дыктара Алега Вінярскага праблему трэба шукаць менавіта на памежжы стагоддзяў, калі адбыўся пэўны катаклізм, які закрануў перш за ўсё гуманітарную навуку: «Структура «мастацкага» адышла ў нябыт, пэўны пласт мастацкай культуры быў заглушаны тэхнічным пераабсталяваннем.





Тэхнічная навала ў пэўным сэнсе прынізіла пісьменніка». Сёння ідзе актыўная арыентацыя на кампетэнтнасць і прафесіяналізм, таму перад мікрафонам быццам няма выпадковых людзей. Чалавек перад мікрафонам павінен растлумачыць аўдыторыі ўсе перыпетыі новага палітычнага, эканамічнага, сацыяльнага стану, аперыраваць новымі замежнымі тэрмінамі, дэманструючы сваё веданне тэмы. Вядома, што ў такой канкурэнтнай барацьбе кампетэнтных выступоўцаў словы пісьменнікаў губляюцца, паколькі многія з іх таксама спрабуюць разабрацца ў пераменах. Але калі чалавек маладога пакалення часам не ў стане ацаніць тое, што адбываецца, з аглядкай на гісторыю, таму што не быў сведкам падзей, іх удзельнікам, то пісьменнікі старэйшага пакалення здольныя прааналізаваць сучасныя рэаліі больш асцярожна, некатэгарычна.

На нашу думку, на радыё не хапае пазіцыі чалавека, які ўсё жыццё прысвяціў слову, які ведае, як ім карыстацца, і бачыць, якія працэсы адбываюцца з гэтым словам. А. Вінярскі разважае: «Вось, напрыклад, праграма «Роднае слова»: абмяркоўваецца праблема з мовай, мы можам мільён чалавек з вуліцы запытаць – ну і што? Чаму мы павінны арыентавацца на вуліцу, а не на чалавека, які ўсё сваё жыццё прысвяціў слову? Чалавек з вуліцы сказаў і к вечару ўжо забыў пра тое, што казаў. А ў пісьменніка гэта болем адгукаецца».

Неабходна далучаць пісьменнікаў і да абмеркавання праблемы запатрабаванасці беларускай мастацкай літаратуры, паколькі аўдыторыя ж згублена і трэба па-новаму наладжваць дыялог з чытачом, а часам і новае знаёмства. Акрамя таго, пісьменнікі як людзі, якія ўсё жыццё прысвяцілі слову і здольны фармуляваць свае думкі проста, ясна і даступна, маглі б прыўнесці ў радыёэфір і крыху жыццёвай мудрасці.